НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Дзяржаўная навуковая ўстанова
“Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

Зацверджаны на сходзе работнікаў
пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі
дзяржаўнай навуковай установы
“Інстытут гісторыі Нацыянальнай
акадэміі навук Беларусі”
“03” студзеня 2024 г.

**Прадстаўнік Наймальніка**

Дырэктар дзяржаўнай навуковай
установы “Інстытут гісторыі
Нацыянальнай акадэміі навук
Беларусі”

__________ В.Л.Лакіза
“03” студзеня 2024 г.

МП

**Прадстаўнік працоўнага калектыву**

Старшыня пярвічнай прафсаюзнай
арганізацыі дзяржаўнай навуковай
установы “Інстытут гісторыі
Нацыянальнай акадэміі навук
Беларусі”

__________ Ю.В.Боом
“03” студзеня 2024 г.

МП

Мінск 2024

Администрация Первомайского района г. Минска
Зарегистрирован коллективный договор
№ 146-24
„04" 06. 2024 года



# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Сапраўдны калектыўны дагавор (далей – Дагавор) заключаны паміж Дзяржаўнай навуковай установай "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" (далей – Наймальнік, або Інстытут) у асобе дырэктара Лакізы Вадзіма Леанідавіча, і работнікамі, у асобе пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", ад імя якой выступае прафсаюзны камітэт (далей – Прафкам), у асобе старшыні Прафкама Боом Юліі Вячаславаўны, далей разам названыя "Бакі", а паасобку "Бок".

2. Дагавор з'яўляецца лакальным прававым актам, які рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж Наймальнікам і работнікамі.

3. Мэтай Дагавора з'яўляецца забеспячэнне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця і эфектыўнай працы Інстытута, занятасці работнікаў, належнага ўзроўню аплаты працы, бяспечных умоў працы і рэгуляванне іншых працоўных і сацыяльна-эканамічных адносін.

4. Наймальнік прызнае Прафкам адзіным паўнамоцным прадстаўніком работнікаў установы ў калектыўных перамовах па заключэнні, змяненні і (або) дапаўненні, выкананні Дагавора.

5. Нормы і палажэнні Генеральнага пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 2019–2021 гады (падоўжана на 2022–2024 гады) (далей – Генеральнае пагадненне), Тарыфнага пагаднення аб'яднанай галіновай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў НАН Беларусі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі і Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі на 2023–2026 гады (далей – Тарыфнае пагадненне) абавязковы для выканання Наймальнікам і Прафкамам.

6. Палажэнні Дагавора распаўсюджваюцца на Наймальніка, работнікаў – членаў прафсаюза, вызваленых прафсаюзных работнікаў, непрацуючых пенсіянераў, якія выйшлі на пенсію з Інстытута.

Палажэнні Дагавора аб працоўным часе і часе адпачынку, рэгуляванні ўнутранага працоўнага распарадку, нормах працы, формах, сістэмах, памерах аплаты працы, тэрмінах выплаты і парадку індэксацыі заработнай платы, ахове працы, гарантыях і кампенсацыях, якія прадстаўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам, прымяняюцца ў дачыненні да ўсіх работнікаў Інстытута.

Іншыя палажэнні Дагавора, у тым ліку і тыя, якія прадугледжваюць дадатковыя, у параўнанні з заканадаўствам, гарантыі, кампенсацыі, выплаты сацыяльнага характару, распаўсюджваюцца на работнікаў, ад імя якіх Дагавор не заключаўся, пры ўмове, што яны выкажуць пісьмовую згоду на гэта, а таксама са згоды Бакоў аб распаўсюджванні дзеяння такіх палажэнняў на

*Дырэктар*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*В.Л. Лакіза*

*Старшыня прафкама*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*Ю.В. Боом*

канкрэтных работнікаў.

7. Парадак вядзення перамоў вызначаецца Бакамі.

Патрабаванне аб правядзенні перамоў па працягненні дзеяння Дагавора або заключэнні новага калектыўнага дагавора прад'яўляецца Бокам не пазней чым за два месяцы да заканчэння тэрміну дзеяння Дагавора.

Тэрмін перамоў па працягненні Дагавора не можа перавышаць двух тыдняў.

Тэрмін перамоваў па падпісанні новага калектыўнага дагавора не можа перавышаць аднаго месяца.

8. Змяненні і (або) дапаўненні ў Дагавор уносяцца са згоды Бакоў.
Разгляд пісьмовай прапановы аднаго з Бакоў аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у Дагавор, а таксама правядзенне перамоў аб гэтым, ажыццяўляюцца ў двухтыднёвы тэрмін.

9. Рознагалоссі Бакоў разглядаюцца камісіяй, створанай на раўнапраўнай аснове з упаўнаважаных прадстаўнікоў Бакоў.

10. Ніводны з Бакоў не мае права спыніць перамовы аднабакова.

11. Дагавор, дадатковае пагадненне аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у яго, падпісваюцца пасля правядзення перамоў і дасягенння згоды па ўсіх іх палажэннях.

12. Бакі абавязаны прымаць неабходныя меры для вырашэння канфліктных сітуацый шляхам перамоў на аснове ўзаемнай павагі. У выпадку ўзнікнення калектыўных працоўных спрэчак, іх вырашэнне ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

13. За парушэнне норм заканадаўства аб працы, невыкананне або неналежнае выкананне абавязацельстваў, прынятых у адпаведнасці з Дагаворам, Бакі нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам, Дагаворам.

14. Кантроль за выкананнем Дагавора ажыццяўляецца Бакамі, а таксама прафсаюзамі ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

Разгляд выканання Дагавора праводзіцца Бакамі два разы на год, але не радзей аднаго разу ў паўгодзе. Справаздачы аб выкананні Дагавора заслухоўваюцца на пашыраным пасяджэнні Прафкама і прадстаўнікоў Наймальніка і даводзяцца да работнікаў у электронным выглядзе, а таксама на прафсаюзным сходзе работнікаў адзін раз у год.

15. Дагавор падпісваецца ў 3-х экзэмплярах: 1 экзэмпляр захоўваецца ў Наймальніка, 1 экзэмпляр у Прафкаме, 1 экзэмпляр накіроўваецца ў адміністрацыю Першамайскага раёна г. Мінска.

16. Срок дзеяння Дагавора – тры гады.
Дагавор уступае ў сілу з моманту падпісання і дзейнічае да заключэння новага дагавора.

17. Наймальнік абавязваецца зарэгістраваць падпісаны Дагавор, а таксама ўнесеныя ў яго змяненні і (або) дапаўненні ў мясцовым выканаўчым або распарадчым органе па месцы знаходжання (рэгістрацыі) установы.

| | |
|---|---|
| *Дырэктар* | *Старшыня прафкама* |
| *Інстытута гісторыі НАН Беларусі* | *Інстытута гісторыі НАН Беларусі* |
| *В.Л. Лакіза* | *Ю.В. Боом* |

# ГЛАВА 2
# АГУЛЬНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ БАКОЎ

18. У галіне працоўных і сацыяльна-эканамічных адносін, павышэння эфектыўнасці навуковага працэсу ў галіне фундаментальных прыкладных даследаванняў, дэмакратызацыі кіравання, паляпшэння ўмоў працы, побыту і адпачынку, аховы здароўя работнікаў Наймальнік і Прафкам дзейнічаюць у межах сваіх кампетэнцый.

18.1. Наймальнік:

18.1.1. прадстаўляе інтарэсы Інстытута ў адпаведных структурах Прэзідыума НАН Беларусі па пытаннях бюджэтнага фінансавання, забеспячэння матэрыяльнымі і тэхнічнымі рэсурсамі, абнаўлення і капітальнага рамонту асноўных фондаў, а таксама па іншых пытаннях;

18.1.2. садзейнічае стварэнню спрыяльных працоўных адносінаў у калектыве, умацаванню вытворча-тэхналагічна, выканальніцкай і працоўнай дысцыпліны, укараненню прагрэсіўных метадаў кіравання навуковай і іншай дзейнасцю;

18.1.3. інфармуе Прафкам па пытаннях, якія непасрэдна закранаюць інтарэсы работнікаў Інстытута, у тым ліку: рэарганізацыі або ліквідацыі Інстытута, іншых структурных пераўтварэнняў, якія прадугледжваюць вызваленне работнікаў або змяненне ўмоў іх працы;

18.1.4. забяспечвае ўдзел прадстаўнікоў Прафкама ў пасяджэннях Вучонага савета, працы конкурсных і атэстацыйных камісій.

18.2. Прафкам:

18.2.1. удзельнічае ў распрацоўцы дакументаў Інстытута па працоўных і сацыяльна-эканамічных пытаннях;

18.2.2. Прафкам удзельнічае ў вырашэнні калектыўных працоўных спрэчак.

У выпадку узнікнення калектыўнай працоўнай спрэчкі фарміруецца пагаджальная камісія з роўным прадстаўніцтвам ад Наймальніка і Прафкама для яе разгляду.

Па просьбе работніка прадстаўнікі прафсаюза выступаюць на пасяджэнні камісіі па працоўных спрэчках, якая ўтвараецца з раўнапраўнага прадстаўніцтва Бакоў пры разлядзе індывідуальных працоўных спрэчак, а таксама ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні па іх разглядзе;

18.2.3. выкарыстоўвае правы на вядзенне калектыўных перамоў па заключэнні калектыўных дагавораў і ажыццяўленню кантролю за іх выкананнем. У выпадку невыканання ўмоў калектыўнага дагавора з боку Наймальніка ўносіць прадстаўленні па выпраўленню выяўленых парушэнняў;

18.2.4. ажыццяўляе кантроль за прымяненнем форм, сістэм і памераў аплаты працы, налічэнню заработнай платы, тэрмінамі выплаты заработнай платы;

*Дырэктар*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*В.Л. Лакіза*

*Старшыня прафкама*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*Ю.В. Боом*

18.2.5. кантралюе выкананне заканадаўства па пытаннях сацыяльнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання, патрабуе ад Наймальніка кампенсацыі выдаткаў на выплату матэрыяльных дапамог у сувязі са стратай здароўя работнікамі, якая адбылася па яго віне;

18.2.6. праводзіць работу па ўмацаванню вытворча-тэхналагічна, выканальніцкай і працоўнай дысцыпліны, садзейнічае павышэнню кваліфікацыі, прафесійных ведаў работнікаў, развіццю навуковай творчасці, працоўнага спаборніцтва;

18.2.7. арганізуе кансультацыі па асноўных напрамках працы прафсаюза у сферы эканамічнай і сацыяльнай абароны работнікаў навукі і іншых пытаннях яго дзейнасці;

18.2.8. вывучае вопыт прафсаюзнага руху і на аснове яго аналізу распрацоўвае рэкамендацыі і прапановы па пытаннях дзейнасці прафсаюза.

## ГЛАВА 3
## АРГАНІЗАЦЫЯ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

19.1. Наймальнік і навуковыя работнікі абавязваюцца:

19.1.1. выконваць планы навукова-даследчых работ па ўсіх паказчыках у межах вылучаных асігнаванняў;

19.1.2. прыкладаць намаганні для атрымання дадатковых сродкаў для фінансавання навукова-даследчых работ праз навукова-тэхнічныя праграмы, гаспадарчыя дагаворы, навуковыя і інавацыйныя фонды, замежныя гранты, конкурсныя прапановы, ведамасныя заказы і заданні.

19.2. Для выканання плана навукова-даследчых работ і павышэння статуса навуковага работніка Наймальнік:

19.2.1. у межах вылучаных асігнаванняў своечасова забяспечвае работнікаў навукова-тэхнічнай інфармацыяй, што тычыцца профілю выконваемых даследаванняў і інфармацыяй аб навуковых форумах, якія закліканы садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці навуковых даследаванняў;

19.2.2. аказвае дапамогу работнікам у публікацыі навуковых работ, уключаных у план выдання;

19.2.3. устанаўлівае сувязі з навуковымі ўстановамі, а таксама з вучонымі краіны і замежжа;

19.2.4. удзельнічае ў арганізацыі і правядзенні рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцый, сімпозіўмаў, з’ездаў, семінараў і нарад па навейшых дасягненнях навукі;

19.2.5. ажыццяўляе падрыхтоўку навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі і павышэнне кваліфікацыі работнікаў;

19.2.6. аказвае дапамогу работнікам у падрыхтоўцы і абароне дысертацыйных даследаванняў;

*Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі В.Л. Лакіза*

*Старшыня прафкама Інстытута гісторыі НАН Беларусі Ю.В. Боом*

19.2.7. праводзіць мерапрыемствы, накіраваныя на прыцягненне ў Інстытут перспектыўных навуковых работнікаў, у тым ліку маладых спецыялістаў;

19.2.8. забяспечвае поўную занятасць навуковых работнікаў пры выкананні тэм навуковых даследаванняў у галіне ведаў у адпаведнасці з прафесіяй, кваліфікацыяй і працоўным дагаворам (кантрактам);

19.2.9. забяспечвае работнікаў працоўнымі месцамі, абсталяванымі тэхнічнымі сродкамі, доступам да Інтэрнету, мэбляй і расходнымі матэрыяламі для выканання навуковых праектаў, заданняў і даручэнняў.

19.3. Навуковыя работнікі абавязваюцца:

19.3.1. выконваць навукова-даследчыя заданні на высокім навукова-тэарэтычным і метадычным узроўні, згодна базавых гадавых норм выпрацоўкі (дадатак 1);

19.3.2. рыхтаваць на належным узроўні вынікі даследаванняў да публікацыі, павышаць эфектыўнасць прапаганды навуковых дасягненняў;

19.3.3. укараняць вынікі завершаных даследаванняў у практыку;

19.3.4. пры распрацоўцы навукова-даследчай тэматыкі, абмеркаванні навуковых работ, на навуковых канферэнцыях і дыскусіях кіравацца нормамі прафесійнай этыкі;

19.3.5. павышаць навуковую кваліфікацыю;

19.3.6. выконваць вытворча-тэхналагічна, выканальніцкай і працоўную дысцыпліну, правілы аховы працы, тэхнікі бяспекі, пажарнай бяспекі, беражліва адносіцца да маёмасці Наймальніка.

## ГЛАВА 4
## АПЛАТА ПРАЦЫ

20. Мінімальнымі гарантыямі ў аплаце працы з'яўляюцца тарыфы (аклады), установленыя ў арганізацыях НАН Беларусі для канкрэтных прафесійна-кваліфікацыйных груп, але не ніжэй, чым прадугледжана тарыфнай сеткай для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыроўненыя па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.

21. Індэксацыя заработнай платы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Законам "Аб індэксацыі даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі" і адпаведнымі пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

22. Наймальнік і Прафкам прымаюць меры па распаўсюджванні дзеяння нормаў аплаты працы, прадугледжаных для навуковых работнікаў, на іншых работнікаў, якія ўдзельнічаюць у навукова-даследчым працэсе.

23. Наймальнік:

23.1. узгадняе з Прафкамам Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні

*Дырэктар*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*В.Л. Лакіза*

*Старшыня прафкама*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*Ю.В. Боом*

працы работнікаў дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (далей – Палажэнне);

23.2. ажыццяўляе выплату заработнай платы ўсім работнікам, 5 і 20 чысла кожнага месяца, а выплаты на адпачынак не пазней, чым за 2 дні да яго пачатку, калі ён прадастаўляецца ў адпаведнасці з графікам працоўных адпачынкаў. У іншых выпадках прадастаўлення працоўнага адпачынку сярэдні заробак выплачваецца Наймальнікам са згоды работніка не пазней, чым за 2 працоўныя дні ад яго пачатку.

Пры супадзенні тэрмінаў выплаты заработнай платы з выхаднымі днямі або дзяржаўнымі святамі і святочнымі днямі яна павінна ажыццяўляецца напярэдадні іх.

У выпадку парушэння ўстаноўленых тэрмінаў Наймальнік прымае неадкладныя захады, каб забяспечыць згаданыя выплаты.

## ГЛАВА 5
## АХОВА ПРАЦЫ І ЗДАРОЎЯ РАБОТНІКАЎ

24. У адпаведнасці з заканадаўствам у галіне аховы працы:

24.1. Наймальнік:

24.1.1. з удзелам упаўнаважаных асоб па ахове працы і Прафкама распрацоўвае і зацвярджае “Палажэнне аб арганізацыі работы па ахове працы ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі”, “Правілы ўнутранага распарадку Інстытута гісторыі НАН Беларусі”;

24.1.2. забяспечвае своечасовы перагляд і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку лакальных прававых актаў па ахове працы;

24.1.3. ажыццяўляе кантроль і каардынацыю дзейнасці структурных падраздзяленняў па забеспячэнні аховы працы, а таксама аховы навакольнага асяроддзя;

24.1.4. спрыяе ў межах адміністрацыйных паўнамоцтваў і фінансавых магчымасцяў арганізацыі адпачынку і аздараўленню работнікаў і іх дзяцей;

24.1.5. стварае бяспечныя ўмовы працы работнікам у памяшканнях (нарматыўны рэжым ацяплення, асвятлення, санітарна-гігіенічныя ўмовы і інш.) і прымае неабходныя захады па прафілактыцы захворванняў;

24.1.6. арганізуе азнаямленне работнікаў с заканадаўствам па ахове працы, кантроль і праверку ведаў па ахове працы, інструктаж па ахове працы;

24.1.7. забяспечвае распрацоўку і правядзенне мерапрыемстваў па паляпшэнню ўмоў працы;

24.1.8. пры наяўнасці фінансавых сродкаў выдзяляе іх для частковай аплаты арганізаваных Прафкамам экскурсій, масавых мерапрыемстваў;

24.1.9. забяспечвае работнікаў, занятых у палявых даследаваннях, спецадзеннем, спецабуткам і сродкамі працы, неабходнымі для выканання

адпаведных работ. Пры іх выездзе ў месцы, аднесеныя да катэгорыі небяспечных, забяспечвае спецыяльным абсталяваннем і сродкамі індывідуальнай абароны.

24.1.10. ажыццяўляе са сваіх сродкаў матэрыяльнае заахвочванне работніка, абранага грамадскім інспектарам па ахове працы, не менш за 10 % аклада;

24.2. Прафкам:

24.2.1. ажыццяўляе грамадскі кантроль за выкананнем Наймальнікам заканадаўства аб ахове працы, правоў і законных інтарэсаў работнікаў у гэтай галіне, арганізуе правядзенне выбараў грамадскага інспектара па ахове працы на агульным сходзе прафсаюза, ажыццяўляе яго неабходнае навучанне;

24.2.2. аналізуе стан умоў і аховы працы ў Інстытуце, адстойвае інтарэсы работнікаў па пытаннях сацыяльнага страхавання (у тым ліку ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці), медыцынскага абслугоўвання, пенсійнага забеспячэння і г.д.;

24.2.3. ажыццяўляе працу па арганізацыі і правядзенні спартыўнай і фізкультурна-масавай работы;

24.2.4. хадайнічае перад Наймальнікам аб вылучэнні сродкаў на паляпшэнне ўмоў працы;

24.3. Пры неабходнасці Наймальнік і Прафкам накіроўваюць прапановы аб ўнясенні змен і дапаўненняў у нарматыўныя акты па пытаннях ільготнага пенсійнага забеспячэння, прадастаўлення дадатковага адпачынку, устанаўлення скарочанага працоўнага дня і іншых відаў ільготаў і кампенсацый па ўмовах працы ў Прэзідыум НАН Беларусі і Аб'яднаную галіновую прафсаюзную арганізацыю работнікаў НАН Беларусі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі для іх разгляду, абагульнення і прадстаўлення ў органы дзяржаўнага кіравання.

24.4. Бакі абавязваюцца разглядаць пытанні аховы працы раз на квартал на сумесных пасяджэннях з заслухоўваннем грамадскага інспектара па ахове працы.

24.5. Бакі заяўляюць аб падтрымцы распрацаванай Міжнароднай асацыяцыяй сацыяльнага забеспячэння Канцэпцыі «нулявога траўматызму» і яе сямі «залатых правілаў».

## ГЛАВА 6
## РЭЖЫМ ПРАЦЫ І АДПАЧЫНКУ

Наймальнік:

25. устанаўлівае норму працягласці працоўнага часу, якая складае 40 гадзін на тыдзень. Іншая норма працягласці працоўнага часу, а таксама суміраваны ўлік ці гнуткі рэжым працоўнага часу устанаўліваюцца ў

адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь (далей – ПК);

26. прадастаўляе работнікам штогадовыя працоўныя адпачынкі ў адпаведнасці з графікам адпачынкаў з захаваннем месца працы (пасады) і сярэдняга заробку. Дапускаецца кампенсацыя часткі нявыкарыстанага адпачынку ў адпаведнасці з ПК;

27. па заяве работніка прадастаўляе адпачынак без захавання заработнай платы па сямейна-бытавых прычынах, для працы над дысертацыяй, напісання падручнікаў і па іншых уважлівых прычынах сумарна да 90 каляндарных дзён на працягу аднаго каляндарнага года;

28. прадастаўляе дадатковы адпачынак за ненарміраваны працоўны дзень згодна з пералікам пасад работнікаў з ненарміраваным працоўным днём і працягласцю дадатковага адпачынку за ненарміраваны працоўны дзень (дадатак 2);

29. прадастаўляе дадатковы адпачынак за працяглы стаж работы ў галіне ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам (арт. 159 ПК) наступнай працягласці:

ад 3 да 5 гадоў – 1 каляндарны дзень;

ад 5 да 15 гадоў – 2 каляндарныя дні;

ад 15 гадоў і вышэй – 3 каляндарныя дні;

30. прадугледжвае дадатковыя меры стымулявання працы для членаў прафсаюза:

30.1. прадастаўленне дадатковага заахвочвальнага адпачынку ў памеры 5 каляндарных дзён для работнікаў, працуючых па кантракце;

30.2. па дамоўленнасці і сумесна з работнікам падзел працоўнага адпачынаку на дзве часткі і болей.

## ГЛАВА 7
## САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ, ІЛЬГОТЫ І КАМПЕНСАЦЫІ

31. Наймальнік сумесна з Прафкамам ажыццяўляе дзейнасць, якая спрыяе паляпшэнню жыллёвых умоў работнікаў Інстытута:

31.1. пастаноўка на ўлік супрацоўнікаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і размеркаванне жылой плошчы адбываецца паводле сумеснага рашэння Наймальніка і Прафкама ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, нарматыўнымі і іншымі актамі;

31.2. размеркаванне жылой плошчы ў інтэрнатах НАН Беларусі адбываецца ў адпаведнасці з “Палажэннем аб парадку прадастаўлення жылой плошчы ў інтэрнатах НАН Беларусі”, зацверджаным сумесным рашэннем Бюро Прэзідыума НАН Беларусі і Прэзідыумам Аб’яднанай галіновай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў НАН Беларусі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі;

31.3. пры размеркаванні жылля ў ЖК “Магістр” у першую чаргу

*Дырэктар*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*В.Л. Лакіза*

*Старшыня прафкама*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*Ю.В. Боом*

задавальняюцца заявы членаў прафсаюза.

32. Пры праходжанні дыспансерызацыі работнікам гарантаваць права на вызваленне ад працы з захаваннем за ім месца працы, пасады і сярэдняга заробку па месцы працы.

Колькасць дзён для вызвалення ад працы з захаваннем за ім месца працы, пасады служачага і сярэдняга заробку па месцы працы залежыць ад узросту работніка:

работнікам, якія не дасягнулі ўзросту 40 гадоў, – 1 дзень раз у тры гады;

работнікам, якія дасягнулі ўзросту 40 гадоў, – 1 дзень раз у год;

работнікам, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, а таксама на працягу 5 гадоў да дасягнення такога ўзросту – 2 дні раз у год.

Работнік вызваляецца ад працы для праходжання дыспансерызацыі на падставе яго пісьмовай заявы. Канкрэтны дзень (дні) вызвалення ад працы неабходна ўзгадніць з Наймальнікам. Пры гэтым Наймальнік не мае права адмовіць работніку ў прадастаўленні дня (дзён) для праходжання дыспансерызацыі. Заяву аб вызваленні ад працы для праходжання дыспансерызацыі работнік падае не менш як за 2 дні да меркаванай даты. Работнік абавязуецца прадастаўляць Наймальніку дакументы, якія пацвярджаюць праходжанне ім дыспансерызацыі па ўстаноўленай заканадаўствам форме.

33. Прафкам ў адпаведнасці з зацверджаным ва ўстаноўленым парадку каштарысам са сваіх сродкаў ажыцяўляе работнікам – членам прафсаюза:

33.1. аднаразовую грашовую выплату за добрасумленны і актыўны удзел у дзейнасці прафсаюза і ў сувязі з юбілеем (ад 50 і далей кожныя 10 гадоў) у памеры да 3 базавых велічынь уключна;

33.2. падарунак у грашовай форме у сувязі з днямі нараджэння (ад 75 і далей кожныя 10 гадоў) у памеры да 3 базавых велічынь уключна;

33.3. набыццё ў адпаведнасці з зацверджаным ва ўстаноўленым парадку каштарысам навагодніх падарункаў работнікам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 17 гадоў уключна;

33.4. набыццё білетаў на навагоднюю елку для работнікаў, якія маюць дзяцей да 14 гадоў уключна;

33.5. матэрыяльную дапамогу ў адпаведнасці з Палажэннем аб Фондзе дапамогі пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.

34. Прафкам садзейнічае арганізацыі працы Савета маладых вучоных, Савета ветэранаў.

| | |
|---|---|
| *Дырэктар* | *Старшыня прафкама* |
| *Інстытута гісторыі НАН Беларусі* | *Інстытута гісторыі НАН Беларусі* |
| *В.Л. Лакіза* | *Ю.В. Боом* |

# ГЛАВА 8
# ГАРАНТЫІ ЗАНЯТАСЦІ РАБОТНІКАЎ

Наймальнік:

35. устрымліваецца ад прыняцця рашэнняў аб масавым скарачэнні работнікаў без наяўнасці вострай неабходнасці, прымае захады па сацыяльнай абароне звольненых работнікаў і стварэнні новых працоўных месцаў;

36. інфармуе (пісьмова) Прафкам за тры месяцы аб мяркуемым масавым вызваленні работнікаў па скарачэнні штатаў;

37. прадастаўляе не менш чым за 2 месяцы ў мясцовы орган службы занятасці (бюро па працаўладкаванню) і ў Профком інфармацыю аб мяркуемым скарачэнні кожнага канкрэтнага работніка з указаннем яго прафесіі (пасады), спецыяльнасці, кваліфікацыі і памеры аплаты працы.

Скарачэнне членаў прафсаюза дапускаецца толькі па папярэдняй згодзе з Прафкамам;

38. прадастаўляе работнікам, што вызваляюцца ў сувязі са скарачэннем колькасці штата ці рэарганізацыяй установы, адзін вольны дзень у тыдзень без захавання заработнай платы для вырашэння пытання аб самастойным працаўладкаванні;

39. пры скарачэнні колькасці або штату работнікаў, акрамя вызначаных у арт. 45 ПК катэгорыямі работніка, прадастаўляе права пераважнага захавання працоўнага месца пры роўнай прадукцыйнасці працы і кваліфікацыі наступным катэгорыям работнікаў:

- членам Прафкама, грамадскаму інспектару па ахове працы, членам камісій па працоўных спрэчках;
- работнікам, у сем'ях якіх няма іншых працаздольных членаў сям'і;
- работнікам, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў;
- работнікам, якія маюць двух і больш утрыманцаў;
- адзінокай маці (бацьку), адзінокаму апякуну (папячыцелю);
- работнікам, якім да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту засталося пяць гадоў і менш;
- работнікам, якія маюць працяглы (больш за 20 гадоў) бесперапынны стаж працы ў Наймальніка і не дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту;

40. уводзіць для работнікаў часовы рэжым няпоўнага працоўнага часу ці прадастаўляе работнікам адпачынкі без захавання заработнай платы ў сувязі з адсутнасцю фінансавання толькі па пісьмовай заяве работніка, улічваючы тэрміны працягласці адпачынку.

41. ажыццяўляе ў мэтах павышэння сацыяльнай абароненасці работнікаў кантроль за тым, каб работнікам, якія атрымалі папярэджанне аб маючым адбыцца іх звальненні ў сувязі са скарачэннем штату, выплачваецца за гэты перыяд заробак у памеры і парадку, прадугледжанымі ў Інстытуце ўмовамі

аплаты працы па адпаведных пасадах, прафесіях, кваліфікацыі;

42. хадайнічае перад адпаведнымі інстанцыямі аб захаванні для работнікаў, вызваленых ў сувязі са скарачэннем штату, магчымасці карыстацца паслугамі, якія прадстаўляюцца ведамаснымі медыцынскімі, спартыўна-аздараўленчымі, дзіцячымі дашкольнымі ўстановамі да часу працаўладкавання на новае месца працы;

43. забяспечвае заключэнне (скасаванне), змены працоўных дагавароў (кантрактаў) у адпаведнасці з артыкуламі 16 – 52, $261^1$ – $261^5$ ПК;

44. прадугледжвае дадатковыя меры стымулявання працы работнікаў:

44.1. заключэнне (працягненне) кантрактаў з работнікамі перадпенсійнага ўзросту (за тры гады да дасягнення агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту) на тэрмін не меншы за тэрмін дасягнення пенсійнага ўзросту;

44.2. заключэнне (працягненне) кантрактаў з маці (бацькам дзіцяці замест маці, апекуном), якая прыступіла да працы да і пасля заканчэння адпачынку па доглядзе за дзіцем да дасягнення ім узросту трох гадоў, на тэрмін не менш, чым да дасягнення дзіцём узросту шасці гадоў;

44.3. права работніка, які працуе па кантракце, разарваць датэрмінова кантракт па згодзе Бакоў, папярэдзіўшы аб гэтым Наймальніка пісьмовай заявай за адзін месяц (па згодзе Бакоў кантракт можа быць разарваны да зыходу тэрміну папярэджання);

44.4. права работніка, які працуе па кантракце, разарваць датэрмінова кантракт па згодзе Бакоў, папярэдзіўшы аб гэтым Наймальніка пісьмовай заявай за 10 дзён пры наяўнасці абставін, якія выключаюць ці значна перашкаджаюць працягу працы (стан здароўя, прызначэнні пенсіі, абранне на выбарную пасаду, пераезд у іншую мясцовасць, догляд за хворымі (інвалідамі) сваякамі, догляд за дзецьмі ва ўзросце да 14 гадоў, змена сямейнага становішча, працаўладкаванне ў іншага наймальніка на поўную стаўку, калі работнік працуе на няпоўную стаўку, або з больш высокім узроўнем аплаты працы);

45. ажыццяўляе заключэнне кантрактаў з работнікамі – членамі прафсаюза – і датэрміновае іх скасаванне па ўзгадненню з Прафкамам.

## ГЛАВА 9
## ГАРАНТЫІ ДЗЕЙНАСЦІ ПРАФКАМА І ПРАФСАЮЗНАГА АКТЫВУ

46. Правы Прафкама і гарантыі яго дзейнасці вызначаюцца заканадаўствам аб прафесійных саюзах, Статутам Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі (далей – Статут), Генеральным і Галіновым пагадненнямі, Дагаворам.

47.Наймальнік:

47.1. прадастаўляе бясплатна ў карыстанне Прафкаму неабходныя для

*Дырэктар*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*В.Л. Лакіза*

*Старшыня прафкама*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*Ю.В. Боом*

ажыццяўлення яго дзейнасці памяшканні, у тым ліку для правядзення сходаў членаў прафсаюза, пасяджэнняў Прафкама, размяшчэння яго органаў, клубаў па інтарэсах, гурткоў, самадзейных мастацкіх калектываў, якія не займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, а таксама стварае іншыя неабходныя для дзейнасці прафсаюза ўмовы ў адпаведнасці з заканадаўствам і ўмовамі Дагавора.

47.2. не дапускае ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы прафсаюза;

47.3. не перашкаджае прадстаўнікам Прафкама наведваць структурныя падраздзяленні, памяшканні і аб'екты, дзе працуюць члены прафсаюза, для рэалізацыі абумоўленых статутам задач і прадастаўленых законам, Дагаворам правоў;

47.4. прадастаўляе членам Прафкама і абраным прафсаюзнай арганізацыяй делегатам час з захаваннем сярэдняга заробку для выканання грамадскіх абавязкаў, удзелу ў рабоце з'ездаў, сходаў, канферэнцый, іншых мерапрыемстваў, а таксама падчас іх кароткатэрміновага прафсаюзнага навучання;

47.5. прадастаўляе час з захаваннем сярэдняга заробку прадстаўнікам прафсаюза для ўдзелу ў калектыўных перамовах. У перыяд правядзення калектыўных перамоў упаўнаважаныя прадстаўнікі не могуць атрымліваць дысцыплінарныя спагнанні, быць звольненымі па ініцыятыве Наймальніка без папярэдняй згоды Прафкама, які ўпаўнаважыў іх весці перамовы;

47.6. не дапускае датэрміновай пераатэстацыі работнікаў, абраных на пасады старшыні і намесніка Прафкама, а таксама членаў Рэспубліканскага камітэта прафсаюзаў (без згоды работнікаў) на працягу тэрміну дзеяння іх паўнамоцтваў і двух гадоў з моманту спынення дзеяння іх выбарных паўнамоцтваў пры адсутнасці парушэнняў вытворчай і працоўнай дысцыпліны;

47.7. не звальняе па ініцыятыве Наймальніка (за выключэннем выпадкаў, выкліканых віноўнымі дзеяннямі) асоб, абраных у склад Прафкама, без папярэдняга пісьмовага паведамлення Прафкама, а старшыні Прафкама – са згоды вышэйстаячай прафсаюзнай арганізацыі;

47.8. не прыцягвае да дысцыплінарнай адказнасці грамадскіх інспектараў па ахове працы і кантролю за захаваннем заканадаўства аб працы, работнікаў, упаўнаважаных прафсаюзам для ўдзелу ў ствараемых у НАН Беларусі камісіях па калектыўных перамовах, разгляду працоўных спрэчак, прымірэнчых камісіях без папярэдняй згоды прафсаюзнага органа;

47.9. устанаўлівае надбаўку за кошт Наймальніка за грамадскую дзейнасць у інтарэсах калектыву не вызваленаму ад асноўнай працы работніку, абранаму старшыней Прафкама ў памеры не менш за 20 % аклада і работніку, абранаму скарбнікам Прафкама ў памеры не менш за 10 % аклада;

47.10. забяспечвае па асабістых заявах членаў прафсаюза, якія маюцца ва ўліковых картках, штомесячнае цэнтралізаванае ўтрыманне з заработнай платы работнікаў членскіх узносаў і пералічэнне іх на рахунак прафсаюзнага органа

*Дырэктар*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*В.Л. Лакіза*

*Старшыня прафкама*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*Ю.В. Боом*

адначасова з выплатай заработнай платы.

48. Прафкам:

48.1. садзейнічае рэалізацыі Дагавора, прадухіленню і ўлагоджванню сацыяльнай напружанасці ў працоўным калектыве;

48.2. даводзіць да ведама работнікаў інфармацыю, звязаную з выкананнем Дагавора, садзейнічае ў неабходных выпадках яе абмеркаванню ў калектыве з наступным абагульненнем меркаванняў калектыва. Даводзіць да ведама Бакоў выказаныя меркаванні;

48.3. забяспечвае кантроль, ахову правоў і гарантый работнікаў у пытаннях аплаты і ўмоў працы, рэжыму працы і адпачынку, забеспячэння занятасці, звальнення, прадстаўлення ільготаў і кампенсацый у адпаведнасці з заканадаўствам;

48.4. садзейнічае прыярытэтнаму прадастаўленню працоўных і сацыяльна-бытавых ільготаў моладзі, жанчынам, іншым слаба абароненым групам работнікаў.

## ГЛАВА 10
## КАНТРОЛЬ І АДКАЗНАСЦЬ ЗА ВЫКАНАННЕМ ДАГАВОРА

49. Кантроль за выкананнем Дагавора ажыццяўляецца Бакамі. Кожны з Бакоў нясе адказнасць за яго рэалізацыю ў межах сваіх паўнамоцтваў і абавязваецца супрацоўнічаць на прынцыпах сацыяльнага партнёрства.

50. Ажыццяўляючы на ўсіх узроўнях кантроль за выкананнем Дагавора, Бакі распрацоўваюць планы мерапрыемстваў па яго выкананню.

Дадатак 1: на 1 с. у 1 экз.
Дадатак 2: на 1 с. у 1 экз.

| | |
|---|---|
| *Дырэктар* | *Старшыня прафкама* |
| *Інстытута гісторыі НАН Беларусі* | *Інстытута гісторыі НАН Беларусі* |
| *В.Л. Лакіза* | *Ю.В. Боом* |

Дадатак 1
Да пратакола пасяджэння вучонага савета Інстытута
29.03.2021 № 4

# РЭКАМЕНДУЕМЫЯ БАЗАВЫЯ ГАДАВЫЯ НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ СУПРАЦОЎНІКАЎ* ІНСТЫТУТА

| № | Пасады | Памеры планавых тэкстаў у аўтарскіх аркушах** | Памеры публікацый у друкаваных аркушах |
|---|---|---|---|
| 1. | Галоўны навуковы супрацоўнік | 3,0 | 2,0 |
| 2. | Вядучы навуковы супрацоўнік | 2,5 | 1,5 |
| 3. | Старшы навуковы супрацоўнік | 2,0 | 1,0 |
| 4. | Навуковы супрацоўнік | 1,5 | 0,75 |
| 5. | Малодшы навуковы супрацоўнік | 1,0 | 0,5 |

* Нормы ўстаноўлены на падставе рашэння вучонага савета інстытута ад 29.03.2021 № 4.
** У тым ліку: можа быць залічана да 50% аб'ёма планавага тэксту матэрыялаў навуковых справаздач аб правядзенні археалагічных даследаванняў, выкананых у рамках ДПНД (форма 1, 2, 3).

*Дырэктар*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*В.Л. Лакіза*

*Старшыня прафкама*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*
*Ю.В. Боом*

Прошито и пронумеровано
16 (шестнадцать) листов

Ведущий специалист [signature] Гарист Т. И.

03 июня 2024 г.

Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» * Рэспубліка Беларусь, г. Мінск *
ДЛЯ ДАКУМЕНТАЎ